# АБ АЎТАРЫТЭЦЕ САПРАЎДНЫМ І ЎЯЎНЫМ

Ц. КІСЯЛЁЎ
Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР

Сапраўдны аўтарытэт—гэта калі за кіраўніком ідуць масы, вераць у яго. Аўтарытэт не прыходзіць сам сабой таму толькі, што чалавека прызначылі на такую вось пасаду. Ён заваёўваецца бескарыслівым служэннем народу, партыі, упартай працай, глыбокім веданнем справы.

Вось яскравы прыклад такога служэння. Восьмы год працуе старшынёй Барысаўскага райвыканкома Мінскай вобласці Іван Міхайлавіч Мажэйка. Ён не малады чалавек. Але энергіі ў яго столькі, што і многія маладыя пазайздросцяць яму. Дзе б ні працаваў Іван Міхайлавіч, які б участак яму ні даверылі, заўсёды ён творча адносіцца да справы.

Галоўнае ў яго стылі—гэта жывая арганізатарская работа ў масах. Іван Міхайлавіч часта бывае ў калгасах і саўгасах; раніцай ён абавязкова ідзе на фермы, у поле, а вечарам, на сходзе, выкажа свае заўвагі, дасць добрую параду, уважліва выслухае думку іншых. Тав. Мажэйка добра ведае не толькі кіраўнікоў саўгасаў і калгасаў, але і перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці. Ён умее ў размове па душах натхніць іх на добрую справу, а за дрэннае не пасаромеецца і моцна пакрытыкаелі не выхваляецца сваім становішчам перад калгаснікамі, а адчувае сябе іх старэйшым таварышам, дарадчыкам і сам многаму вучыцца ў іх. Калгас «17 верасня» вось ужо на працягу дзесяці год з'яўляецца маяком для іншых гаспадарак раёна.

Калі задумваешся над тым, у чым жа сакрэт поспеху такіх кіраўнікоў, як І. М. Мажэйка і Л. К. Пугаўка, а таксама вядомых не толькі ў нашай рэспубліцы, але і за яе межамі старшынь перадавых гаспадарак К. П. Арлоўскага, І. В. Сяргеева і многіх іншых работнікаў, якія карыстаюцца павагай і давер'ем народа, заўсёды прыходзіш да думкі, што яны сталі вядомымі і паважанымі дзякуючы самаадданай працы, беззаветнаму служэнню народу.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

тэтны: заўсёды ж знойдуцца падхалімы, якія будуць узвялічваць яго толькі для таго, каб выкарыстаць яго службовае становішча ў сваіх карыслівых інтарэсах. Такі «аўтарытэт» нічога агульнага не мае з павагай мас.

Дырэктар Баранавіцкага мясакансервавага камбіната Нікіцін лічыўся сярод пэўнага кола людзей як «вялікай душы чалавек». Праверка паказала, што на камбінаце доўгі час беспакарана раскрадаліся матэрыяльныя каштоўнасці і кіраўнікі камбіната не толькі не спынялі жульніцкіх камбінацый, але самі аказаліся ў палоне ў несумленных людзей. На прадпрыемстве ствараліся безуліковыя рэзервы мяса, груба парушалася кантрольна-прапускная сістэма, быў заблытаны ўлік. Нікіцін не прымаў дастаткова строгіх мер да раскрадальнікаў дзяржаўнага дабра.

Вядома, такога кіраўніка «ўважалі» жулікі і махлярысевы. Сумленныя ж работнікі камбіната не маглі яго паважаць. Яны сігналізавалі ў кіруючыя органы аб дрэнным становішчы на камбінаце. Зладзеі і іх апекуны былі выведзены на «чыстую ваду». Бюро ЦК Кампартыі Беларусі выключыла Нікіціна з партыі.

Кіраўнікі з паказным, уяўным

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ